**УДК 808.26-3**

***Жанна Сямёнаўна Сіплівеня***
***Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна***

## ВОБРАЗ ЖАНЧЫНЫ Ў РЭГІЯНАЛЬНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ ГАРАДЗЕНЦАЎ

***Анатацыя.*** *Артыкул прысвечаны аналізу жаночых мянушак, сістэма якіх раскрывае ўяўленні жыхароў Гродзеншчыны пра жанчыну як асобу, яе ролю ў грамадстве, ідэнтыфікацыйныя прыметы. Прадметам апісання стала семантычная структура мянушак, асаблівасці іх функцыянавання ў гродзенскіх гаворках.*

***Ключавыя словы:*** *вобраз жанчыны, карціна свету, антрапонім, мянушка, неафіцыйнае вулічнае імя, семантычная структура, функцыянаванне.*

***Abstract.*** *The article is devoted to the analysis of female nicknames, the system of which reveals the ideas of residents of the Grodno region about a woman as a person, her role in society, identification signs. The subject of the description was the semantic structure of nicknames, the peculiarities of functioning of the nicknames in Grodno dialects.*

***Keywords:*** *the image of a woman, regional view of the world, anthroponym, nickname, informal street name, semantic structure, functioning.*

Як састаўная частка антрапанімікону сістэма мянушак утрымлівае цікавую інфармацыю, вывучэнне якой дазваляе выявіць спецыфіку намінацыі людзей пэўнай тэрыторыі, адметнасці дыялектнай мовы, акрэсліць сукупнасць стэрэатыпных і вобразна-эталонных уяўленняў пра насельнікаў рэгіёна. «Рэгіянальная анамастычная прастора адлюстроўвае не толькі факты моўнага развіцця, але і фарміраванне духоўнага патэнцыялу жыхара той ці іншай мясцовасці, яго культуру, побыт, каштоўнасныя арыентацыі, эмацыйны стан, што ўвасоблена ў элементах антрапанімікону» [1, с. 3–4]. У рэгіянальнай анамастычнай карціне свету рэпрэзентуецца і аб’ектыўная рэальнасць, і сам чалавек як суб’ект, што пазнае гэту рэальнасць. На наш погляд, вобраз чалавека з’яўляецца цэнтральным у моўнай карціне свету, бо менавіта ў мове і праз мову раскрываецца яго сутнасць. «Называючы чалавека, мы адзначаем яго спецыфічныя асаблівасці, вылучаючы як асобу, як прадстаўніка той ці іншай моўнай супольнасці» [2, с 14]. У неафіцыйных зносінах (асабліва ў вясковым

асяроддзі) ідэнтыфікатарам асобы нярэдка выступае мянушка, у функцыі якой уваходзіць паказаць чалавека як індывідуальнасць.

Мянушкі, зафіксаваныя на Гродзеншчыне, утвараюць прыкметны пласт антрапанімічнай лексікі. Разнастайныя паводле структуры і семантыкі, падобныя неафіцыйныя імёны з'яўляюцца своеасаблівым маркерам адносінаў у пэўным калектыве. Мянушкі характарызуюцца ўстойлівасцю, паўтаральнасцю, пераходзяць з пакалення ў пакаленне, а таму захоўваюцца не адно дзесяцігоддзе.

Звычайна мянушкі ўзнікалі як характарыстычныя найменні, што даваліся тым ці іншым прадстаўнікам соцыуму (у пэўнай абмежаванай групе або насельнікам нейкай мясцовасці) «за вочы» з мэтай вылучэння асобы ў калектыве. Як правіла, такое імя паказвала на станоўчыя і адмоўныя якасці яго носьбіта. Пазней згаданая асаблівасць мянушкі магла сцерціся, у далейшым мянушка часта замацоўвалася за чалавекам на ўсё жыццё, перадавалася па спадчыне. Аднак у шэрагу выпадкаў першасная прымета, якая паслужыла падставай для ўтварэння мянушкі, выяўляецца выразна, нягледзячы на тое, што дадзены антрапонім функцыянуе як сродак вылучэння асобы ўжо доўгі час. Пры гэтым такое імя магло зведаць пэўныя змены ў фанетычнай і граматычнай структуры. Вывучэнне ўнутранай формы мянушак, зафіксаваных у гродзенскіх гаворках, дае магчымасць вызначыць спосабы бачання і асэнсавання свету гарадзенцамі, акрэсліць гендарныя стэрэатыпы, якія склаліся ў насельнікаў Гродзеншчыны. У прапанаваным артыкуле праз прызму мянушак мы паспрабуем ахарактарызаваць вобраз жанчыны, вызначыць яе месца ў грамадстве, выявіць адносіны да жанчыны, ідэнтыфікацыйныя прыметы, уласцівыя жаночаму вобразу.

Як мы ўжо згадвалі ў нашых ранейшых даследаваннях [3], у беларускай нацыянальнай традыцыі, у тым ліку і ў традыцыі гарадзенцаў, галоўны абавязак жанчыны – быць добрай маці, вернай жонкай, спраўна весці хатнюю гаспадарку.

Апелятывы *жанчына, баба (бабка, бапця),* якія адлюстроўваюць гендарнаўзроставыя стэрэатыпы, базай для ўтварэння мянушак, як правіла, не выступаюць. Выключэнне складаюць мянушкі накшталт *Баба-мур* 'мянушка дужай, працавітай жанчыны', *Баба гром* 'мянушка дужай і рослай жанчыны', *Баба-яга* 'мянушка жанчыны з доўгім носам'. Не вызначаюцца асаблівым пашырэннем на Гродзеншчыне і мянушкі, што матывуюцца назвамі асобы жаночага полу паводле роднасці і сваяцтва. Намі выяўлены адзінкавыя выпадкі ўжывання простых і састаўных паводле структуры мянушак, што ўзыходзяць да слоў *маці*, *мама* (*мамка*), якія з'яўляюцца назвамі кроўнай роднасці першай ступені, а таксама лексемы *цёця* (*цётка*) – тэрміна кроўнай роднасці па бакавых лініях. Напрыклад: *Мама* 'мянушка жорсткай, патрабавальнай жанчыны-загадчыцы жывёлагадоўчай фермы', *Маці* 'мянушка маладой дзяўчыны, у хаце якой было некалькі катоў, сабак, якіх яна падбірала на вуліцы', *Наша мамка* 'мянушка немаладой настаўніцы, якая да кожнага

вучня заўсёды звярталася са словамі: «Дзіця маё!»’, *Мама Чолі* ‘мянушка немаладой, добразычлівай кабеты, якая звычайна ўсім дапамагае’, *Цёця* ‘мянушка настаўніцы, якая ў размове з вучнямі нярэдка паўтарала: «Я вам не цёця!»’.

Не з’яўляюцца асновай для ўтварэння мянушак і агульнаўжывальныя словы *дзяўчына* (і форма *дзеўка*), *жонка*, што маюць семы ‘незамужняя жанчына’ і ‘замужняя жанчына, жонка каго-небудзь’. Неафіцыйныя імёны *Дзеванька* ‘мянушка ўжо немаладой жанчыны, якая апранаецца як дзяўчына-падлетак’ і *Дзевачка* ‘мянушка старой жанчыны, валасы ў якой яшчэ з маладосці ўвесь час былі заплецены ў кароткія косы і перавязаны яркімі стужкамі’ паказваюць не на ўзрост носьбітаў імя, а на схільнасці і звычкі жанчыны. Іншыя лексіка-семантычныя групы субстантываў, што ўжываюцца ў гродзенскіх гаворках для абазначэння асобы жаночага полу, выступаюць у ролі этымонаў мянушак больш шырока.

Традыцыйна лічыцца, што жанчына – ахоўніца хатняга ачагу, а яе найважнейшы клопат – выхаванне дзяцей. Аднак сёння вобраз жанчыны звязваецца з моцнай, незалежнай асобай, якая можа рэалізаваць сябе ў самых розных сферах жыцця. Яскравым доказам гэтага служаць жаночыя мянушкі, якія актыўна функцыянуюць на Гродзеншчыне. Падобныя неафіцыйныя вулічныя імёны паказваюць на від занятку або характар ці сферу працоўнай дзейнасці жанчыны (*Аграномша* ‘мянушка пажылой кабеты, якая некалі працавала ў калгасе аграномам’, *Апцякарша* ‘мянушка жанчыны-фармацэпта’, *Беларусачка* ‘мянушка настаўніцы беларускай мовы’, *Брыгадзірка* ‘мянушка бабулі, якая ў маладосці ўзначальвала паляводчую брыгаду ў калгасе’, *Газетчыца* ‘мянушка дзяўчыны, якая працуе паштальёнам’, *Фяміда* ‘мянушка жанчыны, якая працуе юрыстам’, *Зубніха* ‘мянушка немаладой жанчыны, якая раней працавала зубным урачом’, *Пчолка* ‘мянушка жанчыны, якая працавала пчаляром’ і інш.).

Базавыя каштоўнасці жанчыны ў пэўнай меры выяўляюцца ў яе паўсядзённай працоўнай дзейнасці, унутраных якасцях. Мянушкі, якія рэпрэзентуюць адносіны жанчыны да працы, вылучаюцца высокай частотнасцю выкарыстання на Гродзеншчыне. Безумоўна, працавітая жанчына выклікае павагу і пашану, яе гаспадарка з’яўляецца прыкладам для іншых. У такой жанчыны ўсё дагледжана, яна і добрая кухарка, і жняя, і пралля. Так, са станоўчай канатацыяй у гродзенскіх гаворках выкарыстоўваюцца мянушкі *Гаспадарка* ‘мянушка спрытнай, працавітай жанчыны’, *Кухарка* ‘мянушка спрытнай, гаспадарлівай кабеты’, *Мурашачка* ‘мянушка працавітай жанчыны’, *Мурашка* ‘мянушка руплівай, працавітай жанчыны’, *Пчолка* ‘мянушка працавітай жанчыны’. Як бачым, асновай для ўтварэння падобных мянушак нярэдка выступаюць назвы насякомых, якія ў беларусаў успрымаюцца як сімвалы працавітасці, руплівасці.

Значна большая колькасць мянушак мае адмоўную канатацыю. Мянушкамі з адмоўнай ацэнкай гарадзенцы звычайна надзяляюць гультаяватых жанчын, якія

не асабліва сочаць за гаспадаркай. У шэрагу выпадкаў разам з гультайствам такіх асобаў вылучае яшчэ і неахайнасць, распусніцтва. Так, да мянушак, якія характарызуюць гультаяватых асобаў ці паказваюць на абыякавыя адносіны жанчыны да працы, можна аднесці антрапонімы *Ахмістрыня* ‘мянушка жанчыны, якая цураецца фізічнай працы’, *Бінда* ‘мянушка неахайнай гультаяватай жанчыны’, *Брында* ‘мянушка гультаяватай, неахайнай кабеты’, *Варона* ‘мянушка гультаяватай жанчыны, якая заўсёды ходзіць у брудным адзенні’, *Дыля* ‘мянушка немаладой жанчыны-гультайкі’, *Лында* ‘мянушка маладой гультаяватай жанчыны, якая не сочыць за сваёй гаспадаркай, не даглядае дзяцей’ і г. д.

Негатыўныя адносіны заўсёды ўзнікаюць да тых, хто злоўжывае гарэлкай, вядзе распусны лад жыцця. Тым больш, калі такія схільнасці мае жанчына. У выніку пакутуе ўся сям’я. Мянушкі, якія характарызуюць жанчын, што злоўжываюць алкаголем, маюць ярка выражаную адмоўную ацэнку (*Абшэрга* ‘мянушка неахайнай жанчыны, якая злоўжывае гарэлкай’, *Глык* ‘мянушка маладой жанчыны, што злоўжывае гарэлкай’, *Чмура* ‘мянушка жанчыны, якая нідзе не працуе і злоўжывае гарэлкай’, *Шлёндра* ‘мянушка распуснай маладой жанчыны, якая часта злоўжывае гарэлкай’, *Сіняя* ‘мянушка кабеты, якая вядзе распусны лад жыцця, злоўжывае гарэлкай’.

Унутраныя якасці жанчыны (добразычлівасць, пяшчота ці суровы нораў), фізічная актыўнасць, няспрытнасць, уменне падтрымліваць добрыя зносіны з аднавяскоўцамі ці празмерная сварлівасць – гэта тыя рысы характару, што нярэдка адлюстроўваюцца ў семантычнай структуры мянушак, якія выражаюць станоўчую ці адмоўную ацэнку іх носьбітаў: *Аса* ‘мянушка злоснай дзяўчыны, якая ўвесь час ходзіць з насупленым тварам’, *Блюма* ‘мянушка панурай, нелюдзімай кабеты’, *Верталёт* ‘мянушка спрытнай у маладосці жанчыны’, *Вясёлка* ‘мянушка добразычлівай жанчыны, з вясёлым характарам’, *Жаба* ‘мянушка непрыгожай, поўнай жанчыны, з вялікімі вачыма’, *Кабыла* ‘мянушка фізічна моцнай, высокай жанчыны’, *Ласка* ‘мянушка спагадлівай, добразычлівай кабеты’, *Ліса* ‘мянушка хітрай, сварлівай жанчыны’, *Мыш* ‘мянушка сціплай, палахлівай дзяўчыны’, *Гадзюка* ‘мянушка жанчыны, якая знарок нярэдка шкодзіць людзям’, *Пташка* ‘мянушка ласкавай старой бабулі’ і г. д. Як бачым, у аснове ўзнікнення названых мянушак ляжаць пэўныя асацыяцыі з прадстаўнікамі фаўны ці з’явамі прыроды.

Вызначальнымі якасцямі любой асобы з’яўляюцца разумовыя здольнасці. І хоць у традыцыйнай беларускай культуры адсутнасць розуму ў жанчыны, яе бяздумнасць не лічыліся вялікай заганай (сведчаннем таму могуць быць і зафіксаваныя на Гродзеншчыне прыказкі тыпу *У бабы розуму не пытай; Дурной бабе і галава мяшае* і пад.), сёння ўяўленні чалавека пра ўзровень інтэлекту жанчыны істотна змяніліся. Разумная жанчына выклікае павагу, някемлівых, недасведчаных жанчын звычайна асуджаюць, высмейваюць. Такія адносіны да разумовых здольнасцей жанчыны, яе рацыянальных паводзін ці глупства выяўляюцца і ў сістэме

мянушак. Напрыклад: *Авечка* ‘мянушка неадукаванай кабеты’, *Варона* ‘мянушка неразумнай няўважлівай жанчыны’, *Мацюха* ‘мянушка неразумнай маладой жанчыны’, *Галава* ‘мянушка разумнай жанчыны’, *Галавастая* ‘мянушка кемлівай дзяўчыны’, *Курыца* ‘мянушка легкадумнай кабеты’ і пад.

Асаблівасці маўлення жанчыны, звычка гаварыць шмат і без сэнсу, умешвацца ў чужыя размовы (а гэта ў традыцыйнай культуры беларусаў, у тым ліку і гарадзенцаў, успрымалася як адмоўная з’ява) адлюстроўваюць мянушкі *Гарлачыха* ‘мянушка крыклівай жанчыны’, *Гаргамэла* ‘мянушка жанчыны, якая часта крычыць без прычыны’, *Дрында* ‘мянушка кабеты, якая шмат гаворыць’, *Лэхаўка* ‘мянушка немаладой жанчыны, якая любіць пагаварыць, ды пры гэтым падманваць’, *Зяпа* ‘мянушка крыклівай упартай дзяўчыны’, *Сарока* ‘мянушка спрытнай на язык жанчыны’, *Нямко* ‘мянушка жанчыны, якая марудна і незразумела гаворыць’, *Два грошы* ‘мянушка жанчыны, якая часта ўмешваецца ў размову людзей, нават не ведаючы іх’.

Аб’ектам рэфлексіі моўнікаў становіцца і знешні выгляд жанчыны. Мянушкі, падставай для ўзнікнення якіх сталі апелятывы, што характарызуюць знешнасць жанчыны, складаюць адну з самых шматлікіх у колькасных адносінах групу адзінак. Ацэнка аблічча жанчыны – яе росту, целаскладу, колеру валасоў, формы твару, носа, вачэй і г. д. – звычайна ажыццяўляецца на візуальным узроўні. У семантыцы неафіцыйных імёнаў падобнага тыпу выяўляюцца стэрэатыпныя ўяўленні чалавека пра адпаведнасць ці неадпаведнасць пэўным нормам, стандартам прыгажосці і дасканаласці чалавечага цела. Пакажам дзеля прыкладу: *Блыха* ‘мянушка маленькай хударлявай жанчыны’, *Бярданка* ‘мянушка высокай нязграбнай дзяўчыны’, *Гарнушка* ‘мянушка невысокай жанчыны’, *Вярба* ‘мянушка худой жанчыны’, *Выглёнда* ‘мянушка дзяўчыны з доўгімі нагамі’, *Дошка-саракоўка* ‘мянушка высокай хударлявай дзяўчыны’, *Трыбухач* ‘мянушка мажнай, поўнай жанчыны’, *Цыганка* ‘мянушка смуглявай чарнавокай жанчыны’, *Дзюба* ‘мянушка жанчыны з доўгім носам’, *Кветка* ‘мянушка зграбнай, ружовашчокай дзяўчыны’, *Красачка* ‘мянушка прыгожай, зграбнай жанчыны’, *Вясна* ‘мянушка ганарлівай жанчыны, якая мае грацыёзны стан’, *Багіня* ‘мянушка прыгожай немаладой жанчыны’.

Такім чынам, катэгорыя мянушак, што функцыянуюць на Гродзеншчыне, дазваляе стварыць цэласны вобраз жанчыны праз ацэнку яе паводзінаў, звычак, унутраных уласцівасцей, адметнасцей знешняга выгляду. У мянушках са станоўчай канатацыяй ухваляецца ўвішнасць, прывабнасць, гаспадарлівасць, дабрыня, кемлівасць, сціпласць жанчыны. Такія імёны рэпрэзентуюць адвечныя эталонныя ўяўленні жыхароў Гродзеншчыны пра жанчыну як асобу, якая дае пачатак жыццю на зямлі, асобу, ад якой залежыць псіхалагічны клімат у сям’і, яе дабрабыт. Мянушкі з адмоўнай ацэнкай выяўляюць тыя заганныя рысы, што не адпавядаюць патрабаванням ідэальнасці, характэрным для менталітэту гарадзенцаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Жалнина, Е. В. Диалектная лексика как отражение региональной антропонимической картины мира: автореф. дис. … канд. филол. наук 10.02.01 / Е. В. Жалнина ; Тамбовский гос. ун-т. – Тамбов, 2013. – 21 с.
2. Шерина, Е. А. Специфика описания языкового образа человека по данным собственно образных слов / Е. А. Шерина // Молодой ученый. – 2011. – № 10 (33). – Т. 2. – С. 50–52.
3. Сіпліваня, Ж. С. Назвы жанчыны ў творах беларускага песеннага фальклору / Ж. С. Сіпліваня // Краявіды роднай мовы. Вып. 2: зб. навук. арт. (памяці прафесара І. Я. Лепешава) / Мін-ва адукацыі РБ, Установа адукацыі «Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я. Купалы» ; адказны рэд. В. Л. Варановіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2017. – С. 127–133.